**І. В. Грабянчук**

# ПАЧАТАК АДНАЎЛЕННЯ МІНСКА Ў АСВЯТЛЕННІ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ДРУКУ (ЛІПЕНЬ 1944 – ТРАВЕНЬ 1945)

У працэсе вызвалення тэрыторыі Беларусі Чырвонай арміяй з верасня 1943 г. па ліпень 1944 г. ад нацысцкай акупацыі адразу ж пачыналіся аднаўленчыя работы. Асаблівае значэнне для гэтай справы мела адраджэнне з руін і попелу сталіцы рэспублікі – г. Мінска. У дадзеным даследаванні неабходна прааналізаваць змест публікацый на гэтую тэму некалькіх рэспубліканскіх газет – “Звязда”, “Советская Белоруссия”, “Чырвоная змена” і “Сталинская молодежь” (пазней вядомая пад назвай “Знамя юности”). Зразумела, што тут немагчыма падрабязна разгледзець усе публікацыі аб аднаўленні Мінска, неабходна толькі вызначыць асноўныя накірункі гэтай тэмы і ацаніць іх грамадска-палітычнае значэнне.

Цэнтральнае месца ў рэспубліканскай прэсе займалі публікацыі, звязаныя з дзейнасцю партыйных і дзяржаўных органаў улады. Сярод іх можна вылучыць паведамленні пра дзейнасць Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных [2; 3; 4; 5], артыкулы партыйных і камсамольскіх функцыянераў аб ролі камуністаў і камсамольцаў у справе аднаўлення беларускай сталіцы [6; 7], аналітычныя матэрыялы, якія адлюстроўвалі ў цэлым ход гэтай справы [8; 9; 10], агітацыйныя адозвы работнікаў канкрэтных прадпрыемстваў [11; 12; 13]. Дадзены інфармацыйны блок рэспубліканскага друку дазваляе чытачу скласці агульнае ўяўленне пра тыя задачы, якія стаялі перад уладамі і жыхарамі Мінска, а таксама пра падыходы і метады, пры дапамозе якіх яны вырашаліся.

Як наладжвалася жыццё вызваленай ад акупацыі сталіцы Беларусі распавядаецца ў кароткім запісе гутаркі карэспандэнта БЕЛТА з кіраўніком Мінскага гарадскога Савета працоўных К. І. Бударыным, якая адбылася 11 ліпеня 1944 года. За першы тыдзень пасля выгнання акупантаў праводзілася актыўная праца па ўборцы і вывазу смецця, рамонту памяшканняў, якія захаваліся. Пачалі працу больш за 100 вулічных камітэтаў. Значную праблему для горада стварылі нямецкія акупанты, падарваўшы пры адступленні ўсе электрастанцыі. Але гэта акалічнасць не перашкодзіла пачатку працы некалькіх найважнейшых прадпрыемстваў, у тым ліку хлебазавода, тытунёвай фабрыкі, дражджавога завода, бровара і інш. Акрамя таго, на працягу першага тыдня пасля вызвалення Мінска ўдалося цалкам аднавіць гарадскую вадаправодную гаспадарку, хуткімі тэмпамі аднаўляліся чыгунка, разбураныя масты, тэлеграфная і тэлефонная сувязь, запрацавала гарадская друкарня. К. І. Бударын адзначаў высокую актыўнасць мінчан у аднаўленні свайго горада: “Во всей проводимой работе огромную помощь советским органам оказывают жители Минска. В горсовет, горком партии и другие учреждения приходят женщины, старики и молодежь, предлагающие услуги по восстановлению родного Минска” [1].

На працягу першых 3 месяцаў пасля вызвалення гарадскія ўлады імкнуліся як мага хутчэй аднавіць крытычна важныя для гарадской інфраструктуры аб’екты. Вялікае значэнне для гэтай справы мелі масавыя нядзельнікі. Напрыклад, у нядзелю 30 ліпеня 1944 г. “у Варашылаўскім раёне… ўдзельнічала ў работах 6 тысяч чалавек, у Сталінскім раёне – 8 тысяч чалавек. Многа людзей выйшла на работу ў Кагановіцкім раёне” [14]. Як можна зразумець з тэксту рэпартажа аб гэтым нядзельніку, такія мерапрыемствы рэгулярна праводзіліся ў розных раёнах Мінска адразу ж пасля яго вызвалення ад акупацыі.

Да сярэдзіны кастрычніка 1944 г. праца па аднаўленні Мінска выйшла на якасна больш высокі арганізацыйны ўзровень. 3 кастрычніка 1944 г. адбылася першая пасля вызвалення сталіцы сесія Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных з удзелам прадстаўнікоў партыйных, прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый, воінскіх часцей і грамадскіх арганізацый горада.

Даклад зрабіў дэпутат Мінскага гарадскога Савета, старшыня Савета Народных Камісараў Беларускай ССР П. К. Панамарэнка. У ім тагачасны кіраўнік БССР адзначыў, што гаспадарка беларускай сталіцы была разбурана на 80 % [2].

Сесія Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных прыняла разгорнутую пастанову, у якой пачатак масавага аднаўлення Мінска быў прымеркаваны да 8 кастрычніка 1944 г. і былі прадугледжаны канкрэтныя мерапрыемствы па аднаўленню сталіцы Беларусі. У яе рэзалютыўнай частцы ўсталёўвалася, што ўсё працаздольнае насельніцтва г. Мінска прыцягваецца да ўдзелу ў разборцы разбураных будынкаў, якія не падлягаюць аднаўленню, расчыстцы будаўнічых пляцовак, атрыманні і аднаўленні будаўнічых матэрыялаў. Прыцягненне насельніцтва да ўдзелу ў аднаўленчых работах ускладалася на выканкамы раённых Саветаў дэпутатаў працоўных (пры актыўным удзеле прафсаюзных, камсамольскіх арганізацый і вулічных камітэтаў).

Пастанова Мінскага гарсавета вызначыла наступныя нормы рабочага часу для жыхароў г. Мінска, якія ўдзельнічалі ў яго аднаўленні:

а) для рабочых і служачых з 8-гадзінным рабочым днём і вольнанаёмнага састава воінскіх часцей – 30 гадзін у месяц;

б) для рабочых і служачых з падоўжаным рабочым днём, для студэнтаў і вучняў – 15 гадзін у месяц;

в) для грамадзян, якія не працуюць на прадпрыемствах, ва ўстановах і арганізацыях – 60 гадзін у месяц.

Тым грамадзянам, якія працавалі над аднаўленнем сваімі сіламі разбураных кватэр, пакояў і на будаўніцтве новых дамоў для сябе, залічваўся час, затрачаны на гэтыя работы, як на работы па аднаўленню гарадской гаспадаркі г. Мінска.

Аднаўленчыя работы, якія выконваліся насельніцтвам на карысць прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый, аплачваліся імі па існуючых здзельных расцэнках. Аплату неабходна было праводзіць за кошт сродкаў, асігнуемых для правядзення дадзеных работ, пасля складання актаў і прыёмкі выкананых работ адмысловымі камісіямі ў складзе тэхнічнага кіраўніка або прараба аднаўляемага або разбіраемага аб’екта, прадстаўніка гаспадарчага органа, для якога праводзяцца работы, і прадстаўніка калектыва, які праводзіў работы [3].

Рэспубліканская прэса асвятляла першы масавы нядзельнік па аднаўленню Мінска, які адбыўся 8 кастрычніка 1944 г. [15]. Пры гэтым неабходна адзначыць: прыметнік “масавы” не азначае, што такая з’ява ўпершыню мела месца менавіта ў гэты дзень. Газетныя публікацыі лета 1944 г. пераканаўча сведчаць, што ўжо тады тысячы жыхароў сталіцы актыўна працавалі на яе аднаўленне. Увосень таго ж года дзяржаўныя і партыйныя органы больш дакладна рэгламентавалі парадак прыцягнення людзей да гэтай надзвычайна важнай справы, распрацаваўшы адпаведныя нарматыўныя дакументы. У ста-

тыстычных адносінах вынік быў дастаткова маштабным: на нядзельніках па аднаўленні Мінска 8 кастрычніка працавалі 30 000 чалавек, 15 кастрычніка – 29 519, 22 кастрычніка – 10 880, 12 лістапада – 17 200 чалавек [16, с. 296].

Газетныя публікацыі не толькі падрабязна распавядалі пра тое, якія прадпрыемствы і ўстановы адраджаліся, тых канкрэтных людзей, якія паказалі выдатныя вынікі ў працы, прыводзілі шмат статыстычных звестак. Прэса выконвала мабілізацыйную функцыю, апелюючы да пачуццяў і настрояў людзей. Напрыклад, газета "Звязда" у нумары ад 15 кастрычніка 1944 г. паведамляла: "У рэспубліканскай літаграфіі надрукаваны першыя тры красачныя плакаты, прысвечаныя аднаўленню сталіцы нашай рэспублікі – горада Мінска. На першым плакаце надпіс: «Ці ўносіш ты сваю долю працы ў аднаўленне Мінска?» Другі з іх звяртаецца да моладзі: «Маладыя мінчане! Аддадзім усе сілы на аднаўленне роднага горада!» Рэпрадукцыя трэцяга плаката змешчана на трэцяй паласе ўзгаданага нумара «Звязды». На ім маладая работніца трымае над галавой дакумент, а надпіс побач паведамляе: «Ты атрымаў «Асабовую кніжку ўдзельніка аднаўлення горада Мінска». Зрабі ўсё, каб хутчэй адрадзіць нашу родную сталіцу!"

У загалоўках матэрыялаў, якія былі прысвечаны тэме пасляваеннага аднаўлення Мінска, актыўна выкарыстоўваўся прыём персаніфікацыі аб'екта прыкладання сваіх высілкаў: "Залечым твае раны, родны Мінск!". Так пісала "Чырвоная змена" 16 верасня 1944 года. У нумары за 10 кастрычніка зварот быў сфармуляваны крыху інакш: "Мы залечым твае раны, родная сталіца". Для ўзмацнення псіхалагічнага эфекту ўздзеяння на чытача ва ўзгаданым вышэй вераснёўскім нумары надрукаваны верш беларускага паэта Анатоля Астрэйкі, які пачынаецца пранізлівымі радкамі:

Я тры гады тут не бываў,
Цябе я кожнай ноччу сніў,
Я зараз вуліц не пазнаў.
Дзе я з маленства рос і жыў.

Хаджу, пытаюся ў людзей,
З журбой блуджу сярод руін,
А вецер стогне і гудзе
Паміж абпаленых цаглін [17].

Але не боль і смутак складаюць асноўны змест гэтага верша. Паэт кажа пра тое, што раны, нанесеныя вайной, будуць залечаны, і спакойнае мірнае жыццё вернецца на родную зямлю:

Збяром мы па цаглінцы зноў
І адбудуем горад свой.
Пастаўнуць клёны між муроў
І з новай зацвітуць вясной.

Акрамя Анатоля Астрэйкі, свае вершы аднаўленню Мінска прысвяцілі Пятрусь Броўка, Антон Бялевіч і іншыя беларускія паэты. Іх творы таксама былі апублікаваны на старонках рэспубліканскага друку.

Яшчэ адзін цікавы аспект у тэме пасляваеннага адраджэння беларускай сталіцы – праектная дзейнасць, скіраваная на вырашэнне гэтай складанай задачы [18; 19]. Газета "Звязда" змясціла групавы фотаздымак тых архітэктараў, якія працавалі ў Мінску. Пад ім змешчаны наступны каментарый: "На здымку (справа налева): архітэктар Воінаў, акадэмік Коллі, акадэмік Мардзвінаў, акадэмік Шчусеў, архітэктар Рубаненка, акадэмік Сямёнаў, прафесар Лангбард; стаяць – архітэктар Сяргееў і архітэктар Трахтэнберг за разглядам планаў рэканструкцыі гарадоў Беларусі" [18].

Газетныя публікацыі даюць добрую магчымасць убачыць, што планавалася па аднаўленні Мінска і што з гэтых планаў было рэалізавана, а што не. У гэтым плане найбольш паказальная наступная цытата (тут і далей пры цытаванні захавана арфаграфія тэксту арыгінала): "Якім-жа павінен быць Мінск? Два кварталы паміж вуліцамі Энгельса і Ленінскай, пачынаючы ад плошчы Свабоды, не будуць забудоўвацца і на месцы іх утворыцца зялёны парк з помнікамі героям Айчыннай вайны, вадаёмамі, фантанамі. На плошчы Свабоды мяркуецца пабудаваць манумент героям Айчыннай вайны. Для складання праекта гэтага манумента будзе аб'яўлен спецыяльны конкурс. Па баках зялёнага парка мы мяркуем размясціць будынак Соўнаркома БССР, Вярхоўнага Совета БССР, Наркамата замежных спраў, музея Айчыннай вайны і пантэон героям-партызанам. Зялёны парк у цэнтры горада сумесна з вялікім скверам перад памяшканнем Дома Чырвонай Арміі створаць ансамбль плошчаў і вялікі рэзервуар паветра і зелені…" [18].

Калі паглядзець на сучасную карту Мінска, то ўбачым, што ў большай частцы гэты праект не быў рэалізаваны. Два кварталы паміж вуліцамі Энгельса і Леніна забудаваны, урад і парламент рэспублікі размясціліся ў іншым будынку, манумент героям Вялікай Айчыннай вайны на плошчы Свабоды не ўзведзены, пантэон героям-партызанам не створаны. У частцы рэалізаванага – музей Вялікай Айчыннай вайны, які першапачаткова размяшчаўся ў Доме прафсаюзаў на плошчы Свабоды, будынак Наркамата замежных спраў, дзе і сёння месціцца Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь, замест вялікага зялёнага парка ў цэнтры – невялікія скверы ў пазначанай лакацыі Мінска. А "вялікі сквер перад памяшканнем Дома Чырвонай Арміі" – гэта Аляксандраўскі сквер, заснаваны яшчэ ў XIX стагоддзі.

Звяртае на сябе ўвагу і такая ідэя: "Некаторыя вуліцы мяркуецца забудаваць віламі для знатных людзей рэспублікі – пісьменнікаў, мастакоў, архітэктараў, кампазітараў, артыстаў, Герояў Совецкага Саюза" [18]. Відавочна, што такая прапанова не дужа стасавалася з ідэалагічнымі стандартамі сацыяльнай роўнасці і сціпласці савецкага чалавека…

Сярод велічных і пампезных планаў у рэчышчы камуністычнай ідэалогіі часам нясмела праглядаюцца спробы зрабіць нешта на карысць беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці: "Каля гістарычнага музея мяркуецца пабудаваць

помнік вядомаму беларускаму культурнаму дзеячу першадрукару Беларусі доктару Грыгорыю Скарыне” [18]. Вядома, помнікі вялікаму беларускаму асветніку ў нашай краіне з’явіліся значна пазней. У разлядаемы час для дзяржаўнага афіцыёзу гэта пытанне мела другараднае, а, магчыма, яшчэ і меншае значэнне. Як бачым, у адной з цэнтральных рэспубліканскіх газет нават імя Скарыны было пададзена ў скажоным выглядзе: у той час замест Францыск часцей выкарыстоўвалі Георгій.

Зіма 1944–1945 гг. часова запаволіла працу па аднаўленні Мінска, але не спыніла яе. Выканкам гарсавета і гаркам КП(б)Б абавязалі ўсіх кіраўнікоў раёнаў сталіцы паўсямесна арганізаваць навучанне будаўнічым прафесіям. Была пастаўлена задача да вясны 1945 г. падрыхтаваць не менш 20 тыс. кваліфікаваных будаўнікоў [20]. Істотныя праблемы меліся з забеспячэннем горада электраэнергіяй. Мінскі гарадскі Савет дэпутатаў працоўных зацвердзіў прымусовы графік электранагрузкі для прамысловых прадпрыемстваў, увёў спажывецкія ліміты для выкарыстання электраэнергіі для асвятлення. Было забаронена выкарыстанне электрычнага асвятлення у дзённы час з 8 гадзін 30 хвілін да 18 гадзін. Тых, хто парушаў правілы эканоміі электраэнергіі, чакала пакаранне ў выглядзе штрафа да 100 рублёў або прымусовыя работы тэрмінам на два тыдні [4].

На сесіі гарадскога Савета дэпутатаў працоўных, якая адбылася ў сакавіку 1945 г., былі названы 4 важнейшыя пытанні, ад вырашэння якіх залежаў поспех працы па аднаўленні Мінска: “гэта пытанні энергетыкі, жыллёвага фонда, паліва і дабрабыту горада” [5]. На гэтай сесіі былі прааналізаваны прычыны шматлікіх недахопаў, якія меліся ў аднаўленчай працы, а таксама было прынята рашэнне, што “з 1 красавіка… аднаўляюцца масавыя работы з удзелам усяго насельніцтва Мінска, па адбудове горада” [4].

Такім чынам, прааналізаваныя матэрыялы рэспубліканскага друку даюць падставу сцвярджаць, што галоўную стаўку ў справе пасляваеннага аднаўлення Мінска (ды і ўсёй краіны ў цэлым) савецкая дзяржава і камуністычная партыя рабілі на працоўны энтузіязм народа. У цяжкіх умовах адразу пасля вызвалення ад нацысцкай акупацыі гэты рэсурс выкарыстоўваўся пераважна стыхійна, а ўвосень 1944 г. былі вызначаны прававыя і арганізацыйныя прынцыпы масавага ўдзелу жыхароў сталіцы ў яе аднаўленні. Гэта было няпроста зрабіць ва ўмовах вайны, якая працягвалася. Важнае значэнне меў ідэалагічны кампанент, калі выкарыстанне розных агітацыйных і мабілізацыйных падыходаў дазваляла сфармаваць прывабную карціну будучыні, якая натхняла людзей на самаадданую працу ў цяжкіх і суровых рэаліях. Важным сродкам вырашэння гэтай задачы была праца па аднаўленні сферы культуры, адукацыі і навукі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Минск сегодня (беседа с председателем Минского горсовета т. К. И. Будариным) // Советская Белоруссия. – 1944. – 12 июля. – С. 2.

2. Сесія Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных // Чырвоная змена. – 1944. – 5 кастрычніка. – С. 1.

3. Рашэнне сесіі Мінскага гарадскога Савета дэпутатаў працоўных аб аднаўленні горада Мінска і працоўным удзеле насельніцтва ў аднаўленні горада // Чырвоная змена. – 1944. – 5 кастрычніка. – С. 2.

4. Решение № 9 Минского городского Совета депутатов трудящихся «Об экономии электроэнергии и упорядочении электроснабжения города Минска» от 10 января 1945 г. // Советская Белоруссия. – 1945. – 21 января. – С. 2.

5. Сесія Мінскага гарадскога Савета // Чырвоная змена. – 1945. – 24 сакавіка. – С. 1.

6. *Савіцкая, Я.* Камуністы ў барацьбе за аднаўленне прамысловасці / Я. Савіцкая // Звязда. – 1944. – 12 верасня. – С. 3.

7. *Бучнев, И.* Минск зовет (слово ворошиловцев) / И. Бучнев // Сталинская молодежь. – 1944. – 8 октября. – С. 1.

8. Сход партыйнага актыва горада Мінска // Звязда. – 1944. – 13 кастрычніка. – С. 2.

9. К новым успехам в 1945 году // Советская Белоруссия. – 1945. – 5 января. – С. 2.

10. Восстановление столицы – всенародное дело // Советская Белоруссия. – 1945. – 1 апреля. – С. 3.

11. Да ўсіх рабочых, работніц, служачых, інтэлігенцыі, да ўсіх грамадзян горада Мінска // Чырвоная змена. – 1944. – 3 жніўня. – С. 2.

12. Выходите на фронтовой декадник! Письмо комсомольцев и молодежи завода № 453 к комсомольцам и молодежи города Минска // Сталинская молодежь. – 1944. – 20 октября. – С. 1.

13. Шырока разгорнем сацыялістычнае спаборніцтва! Зварот калектыва рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых Мінскага мясакамбіната да ўсіх рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых, да ўсіх працоўных горада Мінска // Звязда. – 1944. – 13 кастрычніка. – С. 3.

14. *Яфімаў, С.* Мы адродзім цябе, наш родны Мінск. Масавы нядзельнік працоўных сталіцы / С. Яфімаў // Звязда. – 1944. – 2 жніўня. – С. 3.

15. Працоўныя Мінска выйшлі на адбудову сталіцы. З вялікім уздымам прайшоў масавы нядзельнік 8 кастрычніка // Звязда. – 1944. – 10 кастрычніка. – С. 3.

16. Памяць : Гіст.-дакум. хроніка Мінска : у 4 кн. – Мінск : БЕЛТА, 2005. – Кн. 4-я. – 912 с.

17. *Астрэйка, А.* Мінску / А. Астрэйка // Чырвоная змена. – 1944. – 16 верасня 1944. – С. 2.

18. *Шчарбатаў, Г.* Якім будзе сталічны Мінск / Г. Шчарбатаў, Е. Садоўскі // Звязда. – 30 жніўня 1944. – С. 3.

19. Выстаўка праектаў адбудовы Мінска // Чырвоная змена. – 1945. – 6 красавіка. – С. 3.

20. *Шчарбатаў, Г.* Кліч горада / Г. Шчарбатаў // Звязда. – 1945. – 6 лютага. – С. 2.